# «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА»: МАЛАДЗЁЖНАЙ ГАЗЕЦЕ – СТО ГАДОЎ

***В. І. Канюта***

*Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом “Звязда”», вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, veronika_kanyuta@mail.ru*

Артыкул прысвечаны адной з найстарэйшых маладзёжных газет Рэспублікі Беларусь – «Чырвонай змене» (ЧЗ), якой у красавіку 2021 года спаўняецца 100 гадоў. Аналізуецца гісторыя перыядычнага выдання. Вывучэнне архіва ЧЗ дапамагае ўзнавіць эпоху, калі ствралася першая газета беларускіх камсамольцаў. Узгадваецца перыяд, калі ў «Чырвонай змене» працаваў Б. В. Стральцоў. Прыводзяцца асаблівасці існавання маладзёжнай газеты ў якасці дадатка да «Звязды».

***Ключавыя словы***: журналістыка; сродкі масавай інфармацыі; маладзёжная газета; газета «Чырвоная змена»; «Выдавецкі дом “Звязда”».

# «CHYRVONAYA ZMENA»: A HUNDRED YEARS OF THE YOUTH NEWSPAPER

***V. I. Kanyuta***

*Publishing institution «Publishing house “Zvyazda”», 10-a, B. Khmelnitskogo Str., 220013, Minsk, Republic of Belarus Corresponding author: V. I. Kanyuta (veronika_kanyuta@mail.ru)*

The article is dedicated to one of the oldest youth newspapers of the Republic of Belarus – «Chyrvonaya Zmena» (ChZ), which turns 100 in April 2021. The history of the periodical is analyzed. The study of the ChZ archive helps to recreate the era when the first newspaper of Belarusian Communist Youth Union members was created. It is bringing back to memory the period when Streltsov B. V. worked in «Chyrvonai Zmena». The peculiarities of the existence of a youth newspaper as a supplement to «Zvyazda» are given.

***Key words:*** journalism; media; youth newspaper; newspaper «Chyrvonaya Zmena»; Publishing house «Zvyazda».

21 красавіка 2021 года стагоддзе адзначае адна з самых першых і ўплывовых маладзёжных газет Беларусі (цяпер дадатак да «Звязды») – «Чырвоная змена», дзе ў 1956–1960 гг. працаваў вядомы журналіст і навуковец Барыс Васільевіч Стральцоў. Створанае ў няпростых умовах,

перыядычнае выданне прайшло складаны шлях, пры гэтым ніколі на працяглы час не спыняла свайго існавання. У гады Другой сусветнай вайны «Чырвоная змена» несла весткі з франтоў, натхняла моладзь на барацьбу з ворагам, а ў пасляваенны час адной з першых мабілізоўвала яе на аднаўленне краіны. Архіў газеты з'яўляецца ўнікальным летапісам гісторыі найбольш масавага маладзёжнага руху краіны – камсамола Беларусі, а потым Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

Гісторыя «Чырвонай змены» пачынаецца з II Усебеларускага з'езда Камуністычнага Саюза Моладзі, падчас якога было прынята рашэнне аб стварэнні моладдзю Беларусі свайго друкаванага органа. Менавіта ў дні работы з'езда ўбачыў свет першы выпуск «Красной смены», як спачатку называлася газета. Па сведчанні супрацоўніцы «Чырвонай змены» Р. Самусенкавай, «першы нумар газеты выпускалі строга сакрэтна. Хацелі зрабіць камсамольскаму з'езду «сюрпрыз». Ведалі пра гэты «сакрэт» толькі члены прэзідыума. Але дзе ты той сакрэт захаваеш, калі і ў прэзідыуме, і ў зале клуба імя К. Маркса, дзе праходзіў з'езд, сабраліся шчырыя сябры. І вось «строга па сакрэту» перадаецца з вуснаў у вусны хвалюючая вестка пра тое, што зараз прынясуць "нашу газету"» [1, с. 5].

З'яўленне сваёй газеты стала знамянальнай падзеяй для моладзі, увогуле для перыядычнага друку Беларусі. Першы нумар «Чырвонай змены» пачынаўся са звароту да чытачоў: «Сегодня выходит первый номер газеты рабоче-крестьянской молодежи «Красная смена». Несмотря на все неблагоприятные условия, в которых находится Советская республика, несмотря на тяжелое хозяйственное положение, молодежь Белоруссии имеет свой орган… «Красная смена» будет звать молодежь на работу, на борьбу за идеалы коммунизма» (Красная смена, 1921, № 1). Захаваліся ўспаміны Героя Савецкага Саюза Веры Харужай аб тым, як маладыя людзі адрэагавалі на першы нумар перыядычнага выдання: «Як проста, як добра напісана. Ну, зусім так, як мы размаўляем! Гэта было самае першае ўражанне. Захапляліся аднадушна, чыталі, перачытвалі, паўтаралі асобныя выразы…» [1, с. 7].

Галоўная рэспубліканская газета «Звязда» ў дзень выхаду «Чырвонай змены» на другой старонцы апублікавала карэспандэнцыю пад назвай «Берегите газеты, их у нас мало», у якой адзначала: «Печатное слово в руках рабочих и крестьян является мощным орудием борьбы с классовым врагом. Свое стремление к знанию рабочие и крестьяне доказали жаждой к книге и газетам, посылая иногда за газетами ходоков за десятки верст. И раз рабочие и крестьяне так настойчиво жаждут пролетарской печати, мы им должны всеми силами ее доставлять в деревни и рабочие кварталы…» (Звезда, 1921, 21 красавіка). У такіх умовах выходзіць маладзёжная газета.

З эксклюзіўнага інтэрв'ю, праведзенага аўтарам навуковага артыкула з рэдактарам «Чырвонай змены» ў 1974–1980-х гг., даследчыкам гісторыі беларускай перыёдыкі Уладзімірам Касько, нам стала вядома, што першымі рэдактарамі маладзёжнай газеты ў розны час да 1923 г. былі М. Шэйнман, С. Камрад, Л. Казлоў (па храналогіі). Сафія Фрай, якая ўзначальвала рэдакцыйны калектыў з 1923 па 1925 гг., апісвае цяжкасці, з якімі давялося сутыкнуцца ў першыя гады існавання «Чырвонай змены»: «Нягледзячы на беднасць друкарні, мы стараліся добра аформіць сваю газету, зрабіць яе, як тады гаварылі, «зубастай». Фотаздымкаў не мелі, але часта карысталіся паслугай мастака. Дарэчы, тады афармленнем усіх маладзёжных выданняў займаўся адзін мастак. Калі грошай на аплату яго работы не хапала (а гэта здаралася часта), то выручалі нас нашы юнкоры. Іх малюнкі, карыкатуры, а таксама розныя прыпеўкі і вершы мы друкавалі ахвотна» [1, с. 10].

Першапачаткова газета выходзіла раз на тыдзень. Меркавалася, што да канца 1921 г. «Чырвоная змена» будзе друкавацца двойчы на тыдзень, але даволі часта тэрміны не вытрымліваліся. Якасць нумароў адпавядала свайму часу, фотаздымкаў тагачасныя выданні не змяшчалі. Знешні выгляд «Чырвонай змены» добра праілюстраваны самімі журналістамі: «Усялякай добрай газеце, усялякай кнізе патрэбны малюнкі, патрэбны не толькі для ажыўлення – малюнак тлумачыць тэкст, замацоўвае ў памяці прачытанае. І нашым камсамольскім газетам малюнкі неабходныя. Аднак даць добры малюнак куды цяжэй, чым напісаць добры артыкул» (Чырвоная змена, 1924, 12 красавіка). Нягледзячы на ўсе цяжкасці, папулярнасць выдання расла з кожным нумарам.

Дзякуючы «Чырвонай змене», многія пісьменнікі пачалі свой шлях у вялікую літаратуру. Першыя творы слынных літаратараў Беларусі былі апублікаваны менавіта на старонках маладзёжнай газеты: П. Броўкі, П. Глебкі, Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, С. Законнікава, В. Зуёнка, І. Пташнікава, І. Чыгрынава і інш. Тыя, хто пісаў сюды ў 1920-х гг., сталі ініцыятарамі стварэння першага літаратурнага аб'яднання беларускіх пісьменнікаў «Маладняк». У розны час публікаваліся ў «Чырвонай змене» ужо знакамітыя па тым часе аўтары: Я. Колас, Я. Купала, А. Куляшоў, П. Панчанка, М. Лынькоў, І. Мележ, І. Шамякін, В. Быкаў, У. Караткевіч і інш.

Калі пачалася Другая сусветная вайна, як і многія перыядычныя выданні, «Чырвоная змена» спыніла сваю выдавецкую дзейнасць. Аднак ненадоўга. Выпуск газеты быў адноўлены ў тыле ворага. Падпольная «Чырвоная змена» пачала дзяліць рэдакцыю са «Звяздой», далейшы выхад якой пасля масавых арыштаў журналістаў-падпольшчыкаў у акупаваным ворагам Мінску стаў немагчымым. Асноўнай «прапіскай»

найстарэйшых газет Беларусі ў перыяд са студзеня 1943 г. па сакавік (для «Чырвонай змены») і ліпень (для «Звязды») 1944 г. стаў Любанскі раён, востраў Зыслаў, дзе ў тым ліку размяшчаліся Мінскія падпольныя абкамы КП(б)Б і ЛКСМБ, Любанскі падпольны РК КП(б)Б, штабы некаторых партызанскіх злучэнняў, партызанскі аэрадром, які прымаў самалёты з Вялікай зямлі, а таксама рэдакцыя любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы».

Над выпускам «Чырвонай змены» і «Звязды» працавала ўсяго некалькі чалавек: былы рэдактар Любанскай раённай газеты Піліп Касцюкавец, карэспандэнт даваеннай «Советской Белоруссии» Георгій Шчарбатаў, супрацоўнікі Капаткевіцкай раённай газеты Амяльян Шурпач, Аляксандр Сакевіч, Мікалай Курыка і Ніна Цылько. Узначальваў падпольную рэдакцыю дзвюх газет даваенны рэдактар ЧЗ Міхаіл Барашкаў, які непасрэдна прымаў удзел у падрыхтоўцы кожнага нумара.

Першы падпольны нумар «Чырвонай змены» выйшаў 31 студзеня 1943 г. Раз на тыдзень, па нядзелях, «Чырвоная змена» дзялілася інфармацыяй з франтоў, распавядала пра подзвігі моладзі. «Камсамолец! Калі ты сёння не забіў немца – твой дзень прайшоў бескарысна», – заклікалі газетчыкі юнакоў і дзяўчат далучацца да барацьбы з ворагам (Чырвоная змена, 1943, 4 красавіка). Наколькі «баявой» была газета, можна меркаваць і па наступных радках: «Маладыя патрыёты! Не ідзіце з немцамі на ніякія згоды. Трымайцеся, каб вораг не пахіснуў вашай упэўненасці ў нашу перамогу, каб не завалодаў вамі. Усе на бой з гітлераўцамі за вызваленне сваёй Радзімы ад нямецкай тыраніі!» (Чырвоная змена, 1943, 11 ліпеня).

22 лютага 1944 г. ад тыфу памёр Міхаіл Барашкаў. Гэтая падзея моцна падкасіла супрацоўнікаў падпольнай рэдакцыі. Вось што пісаў А. Шурпач: «не стала нашага рэдактара, уважлівага і чулага дарадчыка, умелага выхаваццеля, бясстрашнага камуніста…» [2, с. 129]. Пахавалі М. Барашкава ў вёсцы Камсамолец пад трыма стройнымі хвоямі.

У тыле ворага выйшла 48 нумароў «Чырвонай змены». У сакавіку 1944 г. рэдакцыя адасобілася ад «Звязды» і перадыслакавалася ў вызвалены чырвонаармейцамі Гомель. Тут газету ўзначаліў Іван Матыль, які кіраваў ёй да 1952 г. Пасля вызвалення сталіцы выданне беларускай моладзі вярнулася ў Мінск. Першы пасляваенны састаў «Чырвонай змены» складалі амаль адны франтавікі і партызаны, многія з іх былі прафесійнымі газетчыкамі. Змяняліся эпохі, а газета з кожным нумарам умацоўвала свой аўтарытэт. Нягледзячы на статус маладзёжнай, у сваіх публікацыях «Чырвоная змена» закранала сур’ёзныя тэмы, рэагавала на

ўсе ключавыя падзеі, якія адбываліся ў краіне. Цікавая дэталь з гісторыі газеты: з камандзіровачным пасведчаннем журналіста «Чырвонай змены» на арбіту лятаў вядомы беларускі касманаўт двойчы Герой Савецкага Саюза Пётр Клімук (Звязда, 2011, 21 красавіка).

Перад тым як трапіць у штат «Чырвонай змены», Барыс Стральцоў меў ужо вопыт працы ў сродках масавай інфармацыі. Падчас службы ў Савецкай арміі друкаваўся ў газеце Групы савецкіх войскаў у Германіі «Советская Армия». Пасля дэмабілізацыі на працягу трох гадоў працаваў у бабруйскай абласной газеце «Савецкая Радзіма». Адначасова скончыў дзясяты клас вячэрняй школы, два курсы завочнай універсітэцкай адукацыі. Аднак, па меркаванні Б. Стральцова, «завочна вучыцца – прыблізна тое ж, што і завочна кахаць. А прага ведаў у пасляваенны час была ў нас неўтаймоўная. Вось і перавёўся я на стацыянар, развітаўшыся, як думалася, з практычнай журналістыкай. Толькі ненадоўга. Мо месяц прабег, як перадаюць мне на курсе, што рэдактар «Чырвонай змены» наказаў пазваніць яму» [1, с. 86]. Менавіта падчас той тэлефоннай размовы тагачасны рэдактар выдання Мікалай Дастанка прапанаваў журналісту паралельна з вучобай на філфаку БДУ працаваць у штаце «Чырвонай змены». Са слоў Б. Стральцова: «Маладзёжная газета – маладзёжны рух. Нейкага падзелу на рангі ў рэдакцыі не было. Быў добры і дружны калектыў. І ў значнай меры дзякуючы Мікалаю Еўкавічу Дастанку, тагачаснаму рэдактару. Ён цаніў людзей найперш за талент, за працаздольнасць і аператыўнасць, а яшчэ – за прыстойнасць» [1, с. 85].

Да свайго 50-годдзя, у красавіку 1971 г., «за мабілізацыю моладзі на выкананне задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва» «Чырвоная змена» была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Вялікую колькасць матэрыялаў для ЧЗ рыхтавалі пазаштатныя карэспандэнты, юнкары. Як зазначае У. Касько, «у тыя гады 60–70 % газетных плошчаў адводзілася пад матэрыялы пазаштатнага актыву. Дапусціць, каб у адным нумары нехта з супрацоўнікаў выступіў у газеце двума-трыма артыкуламі, на працягу доўгага часу друкаваліся адны і тыя ж журналісты – пра гэта нават і рэчы не магло быць. Ці не таму «Чырвоная змена», якая пазней страціла свайго чытача па гэтых прычынах, забылася, на які кантынгент яна працуе, скацілася да тыражу трох тысяч экзэмпляраў і закончыла сваё існаванне…» [3, с. 46].

Як самастойнае выданне «Чырвоная змена» перастала існаваць у красавіку 2002 г. і пачала выходзіць у выглядзе дадатка да «Звязды». Працягвае друкавацца пры рэспубліканскай газеце і пасля набыцця апошняй новага статусу (у лістападзе 2012 г. быў створаны першы ў краіне медыяхолдынг «Выдавецкі дом “Звязда”», які разам з грамадскім

аб'яднаннем «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» з'яўляецца заснавальнікам «Чырвонай змены»). Маладзёжны дадатак друкуецца раз на два тыдні – па чацвяргах, на васьмі старонках фармату А3. Сярод асноўных тэм, якія закранаюць аўтары публікацый: адукацыя і выхаванне моладзі, удзел падрастаючага пакалення ў культурнай і навуковай сферы краіны, папулярызацыя здаровага ладу жыцця, праекты і захапленні маладых беларусаў. Як слушна заўважае даследчык С. Харытонава, «нягледзячы на тое, што «Чырвоная змена» выходзіць у якасці дадатка да «Звязды», старэйшая маладзёжная газета заслугоўвае права мець свой «твар», уласны візуальны вобраз» [4, с. 236].

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Самусенкава Р. Ф*. Вецер гісторыі ў тваіх ветразях…: «Чырвонай змене» – 75 гадоў. Мінск : Закрытае АТ «Беларуская прэса», 1996. 127 с.
2. Наша «Звязда», 1917–1967 гг.: зб. публіцыст.-маст. нарысаў / склад. М. Я. Філімонаў. Мінск : Беларусь, 1968. 267 с.
3. *Касько У. К*. «Звязда» – «Чырвоная змена»: прыклад творчага супрацоўніцтва // матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 90-годдзю газеты «Звязда» і 80-годдзю газеты «Советская Белоруссия»; рэд. кал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2007. С. 45–47.
4. *Харитонова С. В*. Газета «Чырвоная змена»: штрихи к портрету // Медиасфера и медиаобразование: специфика взаимодействия в современном социокультурном пространстве: сборник статей / М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Могилевский высший колледж Министерства внутренних дел Республики Беларусь»: редкол.: С. В. Венидиктов (отв. ред.) [и др.]. Могилев : Могилев. высш. коледж МВД Респ. Беларусь, 2016. С. 232–237.